# Маладой энергіі творчасці далі старт



**6 красавіка ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбылося ўрачыстае адкрыццё Рэспубліканскага конкурсу мастацкай творчасці навучэнцаў устаноў, што забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, – "АРТ-вакацыі". Сёлета гэты маладзёжны творчы форум яго арганізатары, з ліку супрацоўнікаў Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, прысвяцілі 65-й гадавіне вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Дэвіз конкурсу — "Энергіяй творчасці будуем будучыню!".**

Па словах загадчыка аддзела развіцця самадзейнай мастацкай творчасці і маладзёжных ініцыятыў НЦМТДіМ Алены Сяргееўны Лаўрыновіч, у сувязі з вялікімі і светлымі датамі, якія неўзабаве будзе адзначаць наш народ, сёлета было вырашана змяніць звычны фармат урачыстага адкрыцця "АРТ-вакацый" і нават месца яго правядзення (усе мінулыя гады конкурс адкрываўся ў глядзельнай зале Нацыянальнага цэнтра). І вельмі сімвалічна, што творчай энергіі сённяшняй моладзі быў дадзены старт менавіта ў сценах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — на адрыццё конкурсу, акрамя, натуральна, яго юных удзельнікаў з ліку навучэнцаў ПТВ і ССНУ, былі запрошаны ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і ветэраны прафесійна-тэхнічнай адукацыі Беларусі. Сваё непасрэднае ўвасабленне атрымала жывая повязь часоў і пакаленняў, сустрэча гераічнага мінулага і шчаслівага цяперашняга — сустрэліся і паглядзелі ў вочы адзін аднаму тыя, хто некалі крывёю здабываў нашаму народу свабоду, вызваляў нашу краіну ад фашысцкай нечысці, а потым падымаў яе з руін, і тыя, хто не забыўся на гэты баявы і працоўны подзвіг нашых дзядоў, свята даражыць заваяванай імі свабодай і гатовы сёння мірнымі стваральнымі справамі ўслаўляць Радзіму.

Варта было бачыць, як шчыра ветэраны захапляліся ўбачанымі канцэртнымі нумарамі: "Уверцюрай", "Гарэзлівымі мелодыямі" і "Казакамі" ў выкананні народнага аркестра баянаў-акардэонаў "Лад" з Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў, "Венскім вальсам" у выкананні студыі эстрадна-бальнага танца з Мінскага аўтамеханічнага каледжа, вакальнымі выступленнямі навучэнкі Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа гандлю Вольгі Канаш, студыі эстраднай песні "Флэш" з Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа электронікі, вакальнай групы Мінскага дзржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа хлебапячэння, студэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Яўгена Ермалковіча... Апошні (дарэчы, у мінулым навучэнец Мінскага прафесійна-тэхнічнага каледжа будаўнікоў і лаўрэат конкурсу "АРТ-вакацыі" 2005 года) сваім задушэўным выкананнем дзвюх песень ("Родны дом" і "Зязюльчына ранне"), здавалася, сарваў найбольш апладысментаў гледачоў. У вачах некаторых ветэранаў нават блішчэлі слёзы. Закончыўшы сваё выступленне, хлопец расчулена сказаў: "Ад шчырага сэрца хачу сказаць вам словы ўдзячнасці за тое, што сёння ў нас ёсць магчымасць дыхаць свабодным і мірным паветрам. Дзякуй вам за ўсё тое, што вы зрабілі для нас..."

У сваю чаргу да маладых з пранікнёнымі словамі-запаветамі звярнуліся старшыня таварыства блакаднікаў Ленінграда ў горадзе Мінску Марк Аляксандравіч Байрашэўскі (ён, між іншым, нагадаў, што сёлета ў студзені адзначалася яшчэ адна знамянальная дата — 65-годдзе вызвалення Ленінграда ад блакады; сёння ў сталіцы Беларусі жывуць 26 колішніх блакаднікаў) і заслужаны работнік сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі, заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь Васіль Фёдаравіч Бакштаеў, які, у прыватнасці, адзначыў: "Вам, маладым, трэба перш за ўсё вучыцца, самаўдасканальвацца, асвойваць абраную прафесію не проста механічна, а з веданнем справы, з навуковым да яе падыходам... Але мала мець добрыя веды і высокую кваліфікацыю. Трэба яшчэ вельмі любіць сваю краіну, несці гэтую любоў праз усё жыццё. Гэта — галоўнае". У канцы мерапрыемства навучэнцы ПТВ і ССНУ уручылі ветэранам памятныя сувеніры і сфатаграфаваліся разам з імі на памяць.

Творчы марафон пад назвай "АРТ-вакацыі" атрымаў прыгожы і сімвалічны старт. Наперадзе, у маі, удзельнікаў заключнага этапу конкурсу з ліку навучэнскіх калектываў і індывідуальных выканаўцаў, пераможцаў абласных і мінскага гарадскога агляду-конкурсаў, чакаюць рэальныя творчыя спаборніцтвы, падчас якіх будуць прадстаўлены ўсе жанры і кірункі мастацкай творчасці. Мяркуецца, што закрыццё і цырымонія ўзнагароджання пераможцаў адбудуцца ў канцы мая ў Мінску.

**Мікола ЧЭМЕР.**

НА ЗДЫМКУ: выступае студэнт БДУКіМ Яўген Ермалковіч.

**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ